**24.** Вучаніца запісала сказы:

*1. Пасля канферэнцыі паміж двума вучнямі і настаўнікам адбылася цікавая размова.*
*2. Два пасажыры прыпазніліся на аўтобус.*
*3. Не хвалі сабе, няхай людзі пахваляць.*

У якім сказе дзяўчынка дапусціла граматычную памылку?

**А)** усе сказы запісаны правільна. **Б)** ва ўсіх сказах дапушчана памылка.
**В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

**25.** Выберыце словы, у якіх вымаўляецца фрыкатыўны [г]:

*1) гаючы; 2) гарнуць; 3) гузік; 4) грымоты.*

**А)** усе словы. **Б)** усе словы, акрамя 3. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**26.** Як называлася ў старажытным Мінску рака-вуліца?

**А)** Прыпяць. **Б)** Няміга. **В)** Менка. **Г)** Свіслач. **Д)** Дзвіна.

**27.** Выберыце з дадзеных сказ(-ы), у якім(-іх) на месцы пропуску неабходна паставіць працяжнік:

*1. Яны … свае людзі.*
*2. Магутнае дрэва … дуб.*
*3. На дне ракі пясок … жоўценькі, чысценькі.*
*4. Дзетак узгадаваць … не грыбоў назбіраць.*

**А)** усе сказы. **Б)** няма правільных варыянтаў. **В)** 1. **Г)** 2, 3. **Д)** 4.

**28.** Дадзены назвы беларускіх рэк:

*1) Гарынь; 2) Піна; 3) Ясельда;*
*4) Бобрык; 5) Брагінка; 6) Іпа; 7) Сцвіга.*



Калі вы правільна запоўніце клеткі красворда, то ў выдзеленым вертыкальным слупочку прачытаеце назву ракі, якую ў народзе называюць падчас паводкі на Палессі ***Прэсным морам***.

**А)** 1, 3, 5, 2, 7, 6, 4. **Б)** 2, 4, 5, 6, 3, 1, 7. **В)** 3, 7, 6, 5, 1, 4, 2.
**Г)** 4, 6, 2, 3, 7, 1, 5. **Д)** 2, 5, 4, 6, 3, 7, 1.

**29.** Які адпаведнік у беларускай мове мае назоўнік з рускай мовы ***вилок***?

*1) кафтан; 2) альвас; 3) качан; 4) акраец.*

**А)** няма правільнага варыянта. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.

**30.** Лічэбнік пачаў лічыцца самастойнай часцінай мовы з … .

**А)** XV стагоддзя. **Б)** XVI стагоддзя. **В)** XVII стагоддзя.
**Г)** XVIII стагоддзя. **Д)** XIX стагоддзя.

Конкурс арганізаваны і праводзіцца Грамадскім аб'яднаннем «Беларуская асацыяцыя «Конкурс» сумесна з Акадэміяй паслядыпломнай адукацыі пад эгідай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

220013, г. Мінск, вул. Дарашэвіча, 3–218
тэл. (017) 292 80 31, 290 01 53
e-mail: info@bakonkurs.by http://www.bakonkurs.by/

ГА «БА «Конкурс». Заказ 15. Тыраж 32700 экз. г. Мінск. 2014 г.

# Конкурс па беларускай мове «БУСЛІК-2014»

*Чацвер, 20 лютага 2014 года*

- працягласць работы над заданнем 1 гадзіна 15 хвілін;
- карыстацца падручнікамі, канспектамі, справачнай літаратурай забараняецца;
- кожны правільны адказ адзначаецца трыма, чатырма ці пяццю баламі; колькасць балаў, якія атрымлівае ўдзельнік, адказваючы на пытанне правільна, вызначаецца складанасцю пытання (10 лягчэйшых пытанняў – па 3 балы, 10 найбольш складаных – па 5 балаў, астатнія 10 – па 4 балы); складанасць пытання вызначаецца па колькасці ўдзельнікаў, якія правільна на яго адказалі;
- няправільны адказ адзначаецца чвэрцю балаў, прадугледжаных за дадзенае пытанне, і залічваецца са знакам «мінус», у той час, як не даўшы адказу, удзельнік захоўвае раней набраныя балы;
- на кожнае пытанне маецца толькі адзін правільны адказ;
- на старце ўдзельнік атрымлівае авансам 30 балаў;
- максімальная колькасць балаў, якую можа атрымаць удзельнік конкурсу, – 150;
- самастойная і сумленная работа над заданнем – галоўнае патрабаванне арганізатараў да ўдзельнікаў конкурсу; пры парушэнні гэтых патрабаванняў удзельнікі могуць быць дыскваліфікаваны;
- пасля заканчэння конкурсу лісток з заданнем застаецца ўдзельніку;
- вынікі ўдзельнікаў размяшчаюцца на сайце http://www.bakonkurs.by/ праз 1-1,5 месяцы пасля правядзення конкурсу.

## Заданне для вучняў 7-8 класаў

**1.** Колькі дзеепрыметнікаў ужыта ў вершаваных радках Максіма Лужаніна?

*Суджана, стаўлена пад перакладзіны,*
*Сечана, палена і не аддадзена,*
*Не парастрачвана і не раскрадзена,*
*Рупна ў падмуркі на золку пакладзена*
*Роднае слова!*

**А)** 0. **Б)** 5. **В)** 7. **Г)** 8. **Д)** 9.

**2.** Якія з дадзеных слоў пішуцца з апострафам?

*1) кастан..еты; 2) ін..екцыя; 3) бул..ён; 4) кан..юктывіт; 5) Кас..ян.*

**А)** усе словы. **Б)** няма правільных варыянтаў. **В)** 1, 3, 5. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 5.

**3.** Вызначце правільна напісаныя прыметнікі:

*1) свежанькі; 2) мяканькі; 3) шэранькі; 4) ціханькі.*

**А)** усе прыметнікі. **Б)** няма правільных варыянтаў. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 5.

**4.** Вызначце рад з «лішнім» займеннікам:

*1) вы, яны, ты; 2) нехта, нейкі, сябе; 3) такі, той, столькі.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма правільных варыянтаў. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

**5.** У якіх словах на месцы пропуску неабходна напісаць літару ***я***?

*1) ген..рал; 2) дз..сятковы; 3) л..снічоўка; 4) в..рацяно.*

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** няма правільных варыянтаў. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 4.

**6.** Дадзены словазлучэнні:

*1) залаты ўспамін; 2) глухі зычны; 3) воўчы апетыт.*

У якіх словазлучэннях прыметнікі ўжыты ў пераносным значэнні?

**А)** ва ўсіх прыкладах. **Б)** няма правільных варыянтаў.
**В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

**7.** Выберыце з дадзеных устойлівыя спалучэнні слоў:

*1) сцяўшы зубы; 2) у сенцах шукаючы; 3) паклаўшы руку на сэрца;*
*4) няўрокам кажучы; 5) дастаўшы грошы з кішэні.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма правільных варыянтаў.
**В)** 1, 3, 4. **Г)** 2, 4, 5. **Д)** 3, 4.

**8.** Выберыце з дадзеных правільна напісаныя словы:

*1) дэрмацін; 2) твіст; 3) эцют; 4) апладзісменты.*

**А)** усе варыянты. **Б)** няма правільных варыянтаў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3, 5. **Д)** 3, 4.

**9.** Гэту часціну мовы мы даволі часта ўжываем у маўленні. Іменна гэту часціну мовы ў свой час вядомы французскі паэт Шарль Бадлер вобразна ахарактарызаваў у адным са сваіх твораў як анёла руху, які дае фразе жыццё. Пра якую часціну мовы ідзе гаворка?

**А)** назоўнік. **Б)** прыметнік. **В)** дзеяслоў. **Г)** займеннік. **Д)** прыслоўе.

**10.** У якім сказе правільна пастаўлены знакі прыпынку?

*1. Бусел, даляцеўшы да лесу, павярнуў назад і павольна зніжаючыся пачаў набліжацца да ракі.*
*2. Нягледзячы на густы туман, грыбнікі выйшлі на патрэбную сцежку.*
*3. У нядзелю нягледзячы на мароз, ён усё ж такі дапамог бацьку накалоць дроў.*

**А)** ва ўсіх сказах. **Б)** няма правільных варыянтаў. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

**11.** Якія з дадзеных складаных назоўнікаў напісаны правільна?

*1) вярнідуб; 2) прайдзісвет; 3) узвейвецер; 4) перакаці-поле.*

**А)** усе словы. **Б)** усе словы, акрамя 3.
**В)** няма правільных варыянтаў. **Г)** 1, 2. **Д)** 3, 4.

**12.** Вызначце сказ, у якім няправільна ўжыта дзеепрыслоўе:

*1) Вучні атрымалі спіс рэкамендуючых заданняў.*
*2) Над вокнамі ў светлым пакоі былі папрыбіваты карнізы.*
*3) Няцвёрдым хістаючым крокам хворы дайшоў да ложка.*

**А)** усе сказы. **Б)** няма правільных варыянтаў. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

**13.** Дадзены словазлучэнні на рускай мове:

*1) забыть о прошлом; 2) прийти за телеграммой; 3) богатый сравнениями.*

Дадзены адпаведнікі на беларускай мове:

*а) забыцца на мінулае; б) прыйсці па тэлеграму; в) багаты на параўнанні.*

Вызначце правільна запісаныя адпаведнікі на беларускай мове.

**А)** усе варыянты. **Б)** няма правільных варыянтаў. **В)** а, б. **Г)** а, в. **Д)** б, в.

**14.** Выберыце з дадзеных складаныя прыметнікі, якія напісаны правільна:

*1) хімічна аднародны; 2) хуткабежны; 3) ільнаткацкі.*

**А)** усе словы. **Б)** усе словы, акрамя 1.
**В)** няма правільных варыянтаў. **Г)** 1, 2. **Д)** 2, 3.

**15.** Якія знакі прыпынку неабходна паставіць у сказе?

*Белавежская пушча і Браслаўскія азёры Палессе і Свіцязь Налібокі і Нарач Бярэзінскі запаведнік і маленькая рэчка Проня ўсё гэта наш родны край наша спадчына якая аднойчы і назаўсёды даецца кожнаму чалавеку разам з жыццём* (Янка Сіпакоў).

**А)** 5 косак, двукроп’е. **Б)** 5 косак, працяжнік.
**В)** 5 косак. **Г)** 7 косак, працяжнік. **Д)** 6 косак.

**16.** Ад якога дзеяслова з дадзеных нельга ўтварыць дзеепрыметнік незалежнага стану цяперашняга часу?

*1) квітнець; 2) рухаць; 3) адысці.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма правільнага варыянта. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

**17.** Утварыце парныя злучнікі з дадзеных кампанентаў:

*1) як…; 2) раз…; 3) так …; 4) хоць …;*
*а) то; б) але; в) так…; г) што.*

**А)** нельга ўтварыць. **Б)** 1-а, 2-б, 3-в, 4-г. **В)** 1-б, 2-г, 3-а, 4-в.
**Г)** 1-г, 2-в, 3-б, 4-а. **Д)** 1-в, 2-а, 3-г, 4-б.

**18.** Якія з дадзеных займеннікаў не маюць роду і ліку?

*1) іншы; 2) хто; 3) гэта; 4) што; 5) сам.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма правільных варыянтаў. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 5.

**19.** Ад якога прыслоўя з прапанаваных нельга ўтварыць простую форму вышэйшай ступені параўнання?

*1) яскрава; 2) бадзёра; 3) актыўна.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма правільнага варыянта. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

**20.** Выберыце з дадзеных нескланяльныя назоўнікі:

*1) канфеці; 2) тамада; 3) метро; 4) жалюзі; 5) творца.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма патрэбных варыянтаў.
**В)** 1, 3, 4. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 4, 5.

**21.** Якім членам сказа з’яўляецца выдзеленае слова ў сказе?

***Дваццаць*** *дзелім на пяць.*

**А)** дзейнік. **Б)** выказнік. **В)** дапаўненне. **Г)** азначэнне. **Д)** акалічнасць.

**22.** Дадзены дзеясловы:

*1) узяць; 2) прывесці; 3) хадзіць.*

Ад якога(-іх) дзеяслова(-аў) нельга ўтварыць дзеепрыслоўе(-і)?

**А)** усе прыклады. **Б)** няма правільных варыянтаў. **В)** 1, 2. **Г)** 2. **Д)** 3.

**23.** Аб’ектам вывучэння ***лексікалогіі*** з’яўляецца … .

**А)** чалавек. **Б)** эмоцыі. **В)** думкі. **Г)** словы. **Д)** твор.